# АБАВЯЗАК ААН—ІЗАЛЯВАЦЬ СІЛЫ АГРЭСІІ І ВАЙНЫ

**Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР К. В. КІСЯЛЁВА ў агульнай дыскусіі на пленарным пасяджэнні XIX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН 15 снежня 1964 года**

Дэлегацыя Беларускай ССР, заявіў К. В. Кісялёў, лічыць, што намаганні народаў па забеспячэнню міру і мірнага суіснавання паміж дзяржавамі з розным грамадскім ладам прывялі ў апошні час да цэлага раду абнадзейваючых зрухаў, якія робяць станоўчы ўплыў на міжнародную абстаноўку. Услед за Маскоўскім дагаворам, які звузіў сферу гонкі ядзерных узбраенняў і прадэманстраваў імкненне пераважнай большасці дзяржаў да далейшых намаганняў дзеля спынення небяспечных ядзерных выпрабаванняў ва ўсіх асяроддзях, былі дасягнуты іншыя пагадненні, якія таксама абмяжоўваюць працэс накаплення або ўдасканальвання смяротнай зброі або ствараюць лепшыя асновы для супрацоўніцтва ў інтарэсах міру і прагрэсу.

Тым не менш у нас няма падстаў для самазаспакоенасці. У розных частках зямнога шара агрэсіўныя сілы ствараюць ачагі напружанасці, якія тояць небяспечныя вынікі для ўсяго

напружанасці і абмежаванню гонкі ўзбраенняў, сведчаць аб тым, што мы маем справу з радыкальнай праграмай міру, якая адпавядае інтарэсам усіх народаў. Гэты мемарандум прасякнут цвёрдай верай у магчымасць чалавецтва вырашаць тыя праблемы, якія яго хвалююць. Ён прасякнут духам рашучасці не спыняцца перад цяжкасцямі, настойліва дабівацца практычных дзеянняў у інтарэсах умацавання міру.

Дэлегацыя Беларускай ССР цалкам перакапана ў тым, што наспела патрэбнасць у дасягненні дагаворанасці паміж дзяржавамі — членамі ААН аб узмацненні эфектыўнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у забеспячэнні міжнароднага міру і

ня еўрапейскай бяспекі і германскага мірнага ўрэгулявання, К. В. Кісялёў заявіў, што германскае пытанне можна вырашыць толькі і выключна на аснове павагі рэальных фактаў, існуючых у свеце і на нямецкай зямлі. гэта значыць на аснове прызнання суверэнных германскіх дзяржаў ГДР і ФРГ, на аснове юрыдычнага замацавання існуючых граніц германскіх дзяржаў і нармалізацыі адносін з абедзвюма германскімі дзяржавамі і паміж самімі германскімі дзяржавамі. Германскае пытанне нельга вырашыць да таго часу, пакуль ФРГ не адмовіцца ад усякіх спроб авалодаць ядзернай зброяй.

Генеральная Асамблея павінна асудзіць кампанію правакацый і нянавісці супраць Кубы, заклікаць да павагі свяшчэннага права народаў на самавызначэнне і свабоднае развіццё, запатрабаваць нармалізацыі абстаноўкі ў раёне Карыбскага мора.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы